# ЗАМОВЫ БРЭСТЧЫНЫ: СРОДКІ СТВАРЭННЯ ВОБРАЗНАСЦІ

*Аксёнава Анастасія Сяргееўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Замовай з'яўляецца "традыцыйная рытмічна арганізаваная формула, якую чалавек лічыў магічным сродкам дасягнення розных практычных мэт. Замове прыпісвалі безумоўную сілу прымусовага ўздзеяння на людзей і прыроду перш за ўсё ў сілу таго, што яна асаблівым чынам рытмічна арганізавана" [1, с. 94].

Замовы як жанр вызначаюцца практычнай скіраванасцю сродкаў вобразнасці, у іх амаль не бывае экспрэсіўна-эстэтычнага выражэння. Гэта сродак непасрэднага ўздзеяння на свет. Замовы Брэсцка-Пінскага Палесся падзяляюцца на лекавыя, гаспадарчыя, ахоўныя і прысушкі. Як вобразна-выяўленчыя сродкі намі выяўлены эпітэты. Вартасным сінтаксічным сродкам з'яўляецца паўтор, заваротак.

У замовах звароткамі могуць з'яўляцца імёны святых: *Святая Прачыстая мацер Божая, Госпадзі Сус Хрыстос, сын Божы, ацец Мікола, Святы Пятрок-Павел, Святы Спас, Святы Пакроў* і інш.; найменні жывёл: *змяя змяіная, змяя-змяішча, Пуцімея, Расхацімея, старая Саламаніда*: назвы стыхій: *віцёр*; касмічных аб'ектаў: *маладзік маладой* і інш. Даследчык А. Афанасьеў, разглядаючы генезіс і значэнне асобных вобразаў (святых, нячыстай сілы, хвароб і інш.), робіць вывад, што ўсе яны маюць язычніцкае паходжанне, з'яўляюцца элементамі старажытнай славянскай міфалогіі. Нават абсалютна хрысціянскія персанажы атрымалі язычніцкую афарбоўку ў замовах: "У эпоху хрысціянскую гэтыя найстаражытныя заклікі да стыхійных бажаствоў паднаўляюцца падстаноўкай імёнаў Збавіцеля, Багародзіцы, апосталаў і розных угоднікаў; у народныя замовы пранікае прымесь поглядаў аб магутных сілах прыроды" [2, т. 1, с. 212].

Неабходна згадзіцца з даследчыкам В. Пятровым, што "ў замовах не бывае выпадкова падабраных эпітэтаў. Як параўнанні, вобразы, так і эпітэты ўводзяцца ў змест замовы з практычнай мэтай" [3, с. 126]. Так, напрыклад, у замовах ад рожы фігуруюць эпітэты "рабы", "сіні", "чырвоны", "чорны", якія ўказваюць на знешнія праяўленні хваробы. У

замовах ад вогніку характарыстыкі “балючы”, “калючы”, “свярбучы” сведчаць пра сімптаматычныя праяўленні хвароб.

Вялікая колькасць розных характарыстык хваробы накіравана на “паўнату і вычарпальнасць спісу – з тым, каб выратаваць пацыента ад усіх хвароб, якія магчымыя ў той ці іншай сітуацыі” [4, с. 92]. На думку В. Пятрова, “такое пералічэнне відаў хвароб і частак цела абумоўлена ўяўленнем, што калі не ўзгадаць дадзены від хваробы і дадзеную частку цела, то хвароба будзе працягваць гняздзіцца ў дадзенай частцы цела. Каб пазбавіцца ад хваробы… трэба пералічыць па магчымасці ўсе віды хваробы, порчы, усе віды ўрокаў, усе часткі цела, у якіх могуць знаходзіцца порча, урокі і г. д.” [3, с. 129]; *Загаворваю ад упуду, ад буйной галавы, ад тонкіх валасоў, ад светлых вачэй, ад чуткіх вушэй, ад белага ліца, ад грудзей, ад жывата, ад рук, ад ног, ад накцей, ад лакцей, ад дзвесці жылей, адыйдзь ад (імя) увесь упуд проч! Амінь, амінь, амінь!* [5, с. 306]; *“Дык ляціце ж вы на нябёсы, прынясіце мне семдзесят асінавых дубцоў, дайце мне ў белыя рукі, каб сагнаці мне з гэтай кароўкі мукі: з крутых рог, з бягучых ног, з вісучага хваста, з сапучых наздрэй, з чуючых вушэй, з белага вымя. Тут табе не стаяць, касці не ламаць, цела не мучыць, сініх жыл не сушыць, рацівага сэрца не ташніць”*[5, с. 102].

У ахоўных замовах, напрыклад, ад змей, пералічваюцца ўсе арэальныя віды паўзуноў: *Поле-полём, едзя святы Ягоры сівым канём, з залатым кап’ём. Ён едзя, праяжжая, усіх гадаў пабівая: балотных, падкалодных, махавых, земляных, дваравых, гнаявых, падугольных, лесавых, палявых, вадзяных, межавых, падкаменных* [5, с. 125].

Можна вылучыць наступныя характарыстыкі хваробы: па часе яе дзеяння або з’яўлення: *Хадзіў Бог па ўсём свеці, па чыстаму полю, цвяткі рваў і нам на помач ад рожы даваў: ад рожы-ражавіцы, ад краснай краснавіцы, ад сіняй сінявіцы, ад белай белавіцы, ад сухотныя, ад ламотныя, ад ірвотныя, ад касьцявыя, ад жылавыя, ад пажылныя, ад дзянныя і палудзянныя, ад вячэрнія, ад нашныя, ад палунашныя, ад заравыя, ад раннія* [5, с. 214]; паводле прычыны ўзнікнення. Сярод прычын хваробы часцей за ўсё сустракаюцца *злое вока, злая воля, злы дух.* “Гэта можа тлумачыцца не толькі тым значэннем і той сілай, якія надаваліся ва ўсходнеславянскай міфалогіі слову, погляду, думцы і пачуццям, але можа быць звязана і з універсальным уяўленнем пра “насланасць” любой хваробы, пра тое, што галоўнай яе крыніцай з’яўляецца чужая злая воля (думка, слова, погляд)” [6, с. 87]. Так, эпітэт *чорнае вока* звязаны не толькі

з колерам, але і з уздзеяннем позірку на чалавека: *Урокі, ідзеце на сарокі, на сухія лозы, на трэплозы ад чорнага глаза, ад белага, ад серага, ад галубога, ад чорнага* [5, с. 293]. *Не бойся, мая скаціна, бурая шарсціна, ні ведзьмаў, ні ведзьмакоў, ні чараўніц, ні чараўнікоў, ні паганых дум, ні паганых глаз* [5, с. 56]; *Занімаю пушчу на сем міль, зачыняю зеву духу злому мятровымі ключамі, залатымі замкамі, а ты (назваць карову) хоць іціме дзвесьце, стой на месце* [5, с. 105]; *Ідзі, вывіх, з хаты пылам, з печы дымам за сухія лясы, за быстрыя рэкі, дзе сонейка не грэе, дзе ветрык не вее. Ідзі туды, там табе будзе дабро і харашо* [5, с. 179].

Лакатывы *масты залатыя, мора сіняе, камень сіні, поле чыстае, дуб зялёны, лес сухі; дарогамі крамяністымі, камяністымі, дзе неба з зямлёй стыкаецца* адлюстроўваюць пераважна сувязь з тагасветным наваколлем. Эпітэт *залаты мост* сустракаецца пераважна ў лекавых замовах: *Ішоў апостал залатым мостам, насустрач яго Божая маці* [5, с. 161]; *Ехаў апостал залатым мостам на сівым коніку. Мосцік скалыхнуўся – і звіх мінуўся* [5, с. 173]. Лакатывы тыпу *лес сухей, камень сіні, дарогі крамяністыя, камяністыя, дзе неба з зямлёй стыкаецца* з’яўляюцца пунктам максімальнага ўздзеяння замовы на чалавека: *дзе неба з зямлёй стыкаецца, там Аўдоцейкай падвярот знімаецца* [5, с. 179]; *дзе неба з зямлёй спаткаецца, няхай звіх знімаецца* [5, с. 179].

Часта паўтор у замове не ставарае экспрэсіўнасці, а падкрэслівае функцыянальную ролю тых ці іншых слоў. Пры аналізе сінтаксічнай структуры замовы варта звярнуць увагу на аднародныя члены сказа (пры пералічэнні відаў і прычын хваробы, месца адсылання хваробы і інш.), якія нясуць значны патэнцыял псіхалагічнага ўздзеяння.

Спіс літаратуры:

1. Аникин, В. П. Русский фольклор: учеб. пособие для филол. спец. вузов / В. П. Аникин. – М. : Высш. школа, 1987. – 285 с.
2. Афанасьев, А. Н. Поэтические воззрения славян на природу: опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований в связи с мифическими сказаниями других родственных народов: в 3 т. / А. Н. Афанасьев. – М. : ТОО «Соврем. писатель», 1995. – 367 с.
3. Петров, В. П. Заговоры / В. П. Петров // Из истории русской советской фольклористики. – Л., 1982. – С. 77–142.

4. Агапкина, Т. А. Востонославянские лечебные заговоры в сравнительном освещении: сюжетика и образ мира / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2010. – 824 с.

5. Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч ; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

6. Рабец, Т. Д. Сістэма вобразаў усходднеславянскіх замоў: структурна-семантычны і функцыянальны аспеты / Т. Д. Рабец. – Мінск : Беларуск. навука, 2015. – 299 с.